*В. І. Саітава, І. М. Стрыжонак*
БДУ культуры і мастацтваў, Мінск

# АРГАНІЗАЦЫЯ КІРУЕМАЙ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ ПРЫ ВЫВУЧЭННІ БІБЛІЯТЭЧНА-БІБЛІЯГРАФІЧНАГА КРАЯЗНАЎСТВА

*Адным са шляхоў удасканалення падрыхтоўкі бібліятэкараў у галіне краязнаўства з'яўляецца арганізацыя кіруемай самастойнай работы студэнтаў (КСРС) па блоку бібліятэчна-бібліяграфічных дысцыплін. У артыкуле ўпершыню асвятляюцца пытанні арганізацыі КСРС пры вывучэнні студэнтамі бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства, разглядаецца вопыт выкарыстання модульна-рэйтынгавай сістэмы КСРС і кантролю ведаў. Аўтары акцэнтуюць увагу на неабходнасць забеспячэння КСРС вучэбна-метадычнай базай, на выбар аптымальных форм кантролю, на важнасць індывідуалізацыі заданняў па самастойнай ра-*

*боце, вызначаюць станоўчае выхаваўчае ўздзеянне арганізацыі КСРС пры выкладанні курса «Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства».*

Сучаснае грамадства прад'яўляе ўсё больш высокія патрабаванні да якасці падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй для ўсіх абласцей сацыяльнай практыкі. Ва ўмовах дэмакратызацыі і гуманізацыі грамадскага жыцця змяняюцца і адукацыйныя патрэбнасці маладых людзей – выразна праяўляецца імкненне атрымаць сучасную, прэстыжную і цікавую прафесію. Праца бібліятэкара бесперапынна трансфарміруецца пад уплывам імклівага росту ў развіцці грамадства інфармацыі і ведаў і захоўвае для моладзі многія прывабныя характарыстыкі: інтэлектуальнасці, разнастайнасці, высокай тэхналагічнасці, інтэлігентнасці. Гэта падцвярджаецца ўстойлівым і дастаткова высокім конкурсам на факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый (ФІДК) Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў, дзе падрыхтоўка бібліятэчных спецыялістаў пастаянна павялічваецца як на дзённай, так і на завочных формах навучання, і прафесарска-выкладчыцкі імкнецца зрабіць навучанне эфектыўным і цікавым.

Сярод шматлікіх кірункаў сучаснай бібліятэчнай справы і, адпаведна, падрыхтоўкі кадраў для галіны важнае значэнне надаецца навучанню будучых бібліятэкараў працаваць ва ўмовах абслугоўваемай тэрыторыі, уменню звязваць работу бібліятэкі са спецыфікай тэрыторыі, тымі задачамі, якія вырашаюцца на месцах; дзейнасці па інфармацыйнаму забеспячэнню мясцовага краязнаўчага руху, розных груп насельніцтва, прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў з улікам іх інфармацыйных патрэбнасцей; удзелу бібліятэчнымі сродкамі ў захаванні гісторыка-культурнай спадчыны, у фарміраванні патрыятычнай свядомасці рэгіянальнай супольнасці. Бібліятэчна-бібліяграфічная практыка на сённяшні дзень патрабуе ад спецыяліста ўмення выяўляць, ацэньваць і рэкламаваць розныя віды матэрыялаў аб рэгіёне, ствараць і распаўсюджваць разнастайную інфармацыйнаю прадукцыю краязнаўчага зместу, здзяйсняць арганізацыю бібліятэчна-бібліяграфічнай краязнаўчай работы, наладжваць узаемадзеянні з рознымі суб'ектамі краязнаўчага руху, весці плённую навукова-даследчую працу. Пералічаныя пытанні складаюць прадметнае поле вучэбнай дысцыпліны «Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства», якая выкладаецца студэнтам пятага курса ўсіх спецыялізацый ФІДК.

Вывучаючы дысцыпліну «Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства», студэнты набываюць асноўныя тэарэтычныя, арганізацыйныя, метадычныя і тэхналагічныя веды, уменні і навыкі, неабходныя для дзейнасці ў бібліятэках розных тыпаў.

Вучоныя падкрэсліваюць, што павелічэнне ролі самастойнай работы надае вучэбнаму працэсу больш выражаны практыка-арыентаваны і даследчы характар [1]. Навуковы і педагагічны патэнцыял бібліятэчных дысцыплін, большасць з якіх спалучаюць тэарэтычныя і практычныя веды, прадстаўляюць шырокія магчымасці для выкарыстання кіруемай самастойнай работы студэнтаў (КСРС). Як высока арганізаваная



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

форма вучэбнай дзейнасці, КСРС ахоплівае усе віды аўдыторнай і па-за аўдыторнай самастойнай і даследчай дзейнасці студэнтаў па выкананні імі вучэбнага плана, якая вядзецца на падставе вучэбна-метадычнага забеспячэння, пад кантролем выкладчыка і самакантролем з боку студэнтаў.

Шматгадовы вопыт выкладання і арганізацыі самастойнай працы студэнтаў па курсу, асэнсавання выніковасці выкарыстоўваемых формаў прывёў нас да прымянення модульна-рэйтынгавай сістэмы арганізацыі кіруемай самастойнай работы студэнтаў і кантролю ведаў (КСРС і КВ). Змястоўныя публікацыі выкладчыкаў БДУ, РІВШ і іншых навучальных устаноў аказалі аўтарам істотную дапамогу ў працэсе ўкаранення інавацыйнай педагагічнай тэхналогіі [1–5]. Мы разлічвалі таксама пераадолець адмоўную студэнцкую традыцыю завяршаць выкананне неабходных работ напярэдадні заліку, асабліва характэрную для 5-курснікаў.

Падставай для ўкаранення модульна-рэйтынгавай сістэмы з'явілася падзяленне дысцыпліны на 4 модулі, кожны з якіх адпавядае завершанаму раздзелу вучэбнага курса. Модулі лагічна і паслядоўна раскрываюць змест курса, ствараючы магчымасць яго паэтапнага засваення. У асобны модуль уключаны: змест праграмы, вучэбны матэрыял (тэкст лекцый па разглядаемых тэмах у аб'ёме да 12 старонак па кожнай), распрацоўкі семінарскіх і лабараторных заняткаў з метадычнымі ўказаннямі і тэмамі павышанай складанасці для падрыхтоўкі дакладаў і заданняў даследчага і творчага характару, тэрміналагічны слоўнік, спісы асноўнай і дадатковай літаратуры, пералік вучэбна-наглядных матэрыялаў на розных носьбітах (у электроннай бібліятэцы універсітэта прадстаўлены лепшыя электронныя інфармацыйныя прадукты, створаныя студэнтамі ў межах курса), тэмы рэфератаў, тэставыя заданні, пытанні для кантролю і самакантролю ведаў, ліст уліку бягучай паспяховасці і кантролю самастойнай работы студэнтаў.

Значная работа была праведзена для забеспячэння студэнтаў належнай вучэбна-метадычнай базай. Падрыхтаваны тыпавая і рабочая праграмы і вучэбна-метадычны комплекс па курсу сталі асновай арганізацыі КСРС. Напаўненне вучэбна-метадычнага комплексу ахоплівае кампаненты, якія прапануюцца ў сучасных вучэбных выданнях для ВНУ [2; 3; 5]. На іх аснове быў падрыхтаваны курс лекцый на машыначытальным носьбіце, прадстаўлены ў электронную бібліятэку універсітэта*. Дадзены электронны рэсурс запоўніў дэфіцыт базавага вучэбнага дапаможніка па курсу, што істотна для рэалізацыі модульна-рэйтынгавай сістэмы арганізацыі КСРС і КВ.

Вызначаныя для аўдыторнага правядзення тэмы лекцый, семінарскіх і лабараторных заняткаў змяшчаюць фрагменты КСРС, некалькі тэм і шэраг пытанняў студэнты павінны самастойна вывучаць у

---

* Наколькі вядома аўтарам, друкаваныя вучэбныя дапаможнікі па дысцыпліне «Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства» ў Расіі і іншых краінах СНД не выходзілі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

па-за аўдыторны час. У пачатку курса студэнты атрымалі каляндарны графік з падрабязным адлюстраваннем усіх заданняў па самастойнай рабоце і формаў катролю і кансультацыю па прымяненні рэйтынгавай сістэмы. Гутаркі аб значэнні выканання гэтых работ для прафесійнай падрыхтоўкі і тлумачэнне правільнасці і справядлівасці ацэнкі розных іх відаў прыхільна ўспрымаюцца студэнтамі. З пачатку зносін мы імкнуліся поўна выкарыстаць перавагі вучэбнай матывацыі, да чаго, са свайго боку, станоўча ставяцца ўжо «вопытныя» 5-курснікі.

Тэарэтычны і прыкладны характар бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства паўплываў на выбар формаў і зместавага напаўнення самастойнай работы. Былі закладзены заданні, звязаныя з вывучэннем, канспектаваннем і аналізам актуальных манаграфій і артыкулаў, падрыхтоўкай краязнаўчай бібліяграфічнай прадукцыі і яе прэзентацыі з выкарыстаннем аўтаматызаваных тэхналогій, бібліяграфічнага пошуку ў базах даных і іншых рэсурсах інтэрнета, пісьмовыя (кантрольныя) работы, індывідуальныя гутаркі, тэсціраванне. Кантрольныя работы і тэсціраванне прымяняюцца для падвядзення вынікаў дзейнасці студэнтаў па модулях. Па бібліятэчна-бібліяграфічным краязнаўстве студэнты пішуць курсавыя і дыпломныя работы. Пачатак уваходжання у рытм працы, зададзены модульна-рэйтынгавай сістэмай, выклікаў у часткі студэнтаў спадзяванне, што яны могуць працягваць вучобу па былой схеме («штурмаваць» курс на апошнім этапе). Каля 15–20 % студэнтаў у асобных групах не пераадолелі пісьмовага кантролю па варыянтах па першаму модулю, прысвечанаму тэарэтычнаму раздзелу курса («Асновы тэорыі і арганізацыі краязнаўчай дзейнасці бібліятэк»). Даная канфліктная сітуацыя патрабавала дадатковай працы са студэнтамі, абраўшымі пазіцыю мінімальных намаганняў, і цвёрдай пазіцыі выкладчыкаў, што ўмовы дзеючай сістэмы не будуць змяняцца і з'яўляюцца аднолькавымі для ўсіх студэнтаў. Далейшая праца па модульна-рэйтынгавай сістэме мабілізавала студэнтаў на своечасовае, а некаторых і на датэрміновае выкананне разнастайных відаў кіруемай самастойнай работы.

Самастойная работа ў межах лекцый, семінараў і лабараторных (аўдыторных) заняткаў па курсу звязаны з мэтамі і задачамі, якія ставіліся на кожным з іх, з асаблівасцямі зместу вучэбнага матэрыялу (дамініраванне тэарэтычнага ці практычнага (тэхналагічнага) характару, узровень складанасці і інш.). Напрыклад, падчас лекцыі па тэме «Краязнаўчы даведачна-бібліяграфічны апарат бібліятэкі» 3 студэнты прадэманстравалі кароткія электронныя прэзентацыі, падрыхтаваныя імі па асобных пытаннях лекцыі, з тэкстам якой яны пазнаёміліся раней. Прэзентацыі праілюстравалі наяўнасць электронных краязнаўчых каталогаў, краязнаўчых баз даных розных відаў у трох абласных бібліятэках Беларусі, прадстаўляемыя на іх аснове інфармацыйныя паслугі ўдаленым карыстальнікам. Рыхтуючы іх, студэнты не толькі вывучылі патрабаванні да аптымальнага складу асобных кампанентаў краязнаўчага даведачна-бібліяграфічнага апарату, іх функцыянальныя асаблівасці, але праналізавалі буйнейшыя рэальныя электронныя краязнаўчыя рэ-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сурсы, іх месца ў структуры гэтага апарату. Выступленні студэнтаў як партнёраў лектара стымулююць калектыўную рэфлексію, падштурхоўваюць іншых студэнтаў да выканання творчых заданняў. У большасці лекцыйных тэм выкарыстоўся метад удзелу студэнтаў у аналізе і вырашэнні праблемных сітуацый бібліятэчнага бібліяграфічнага краязнаўства і самастойнае выкананне студэнтамі некаторых невялікіх канкрэтных заданняў.

Шырокія магчымасці кіруемай самастойнай работы прадстаўляюць семінарскія і лабараторныя заняткі. У прыватнасці, падчас гэтых заняткаў студэнты выяўляюць тыя новыя навуковыя, метадычныя і тэхналагічныя паняцці, якія з'явіліся ў прадметным полі бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства, але не разглядаліся ці недастаткова закраналіся ў ходзе лекцый. Перад студэнтамі ставіцца задача самастойна асэнсаваць паняцці (іх аб'ём, змест і інш.) Лічым, што такія заданні практыкуюць уважлівасць да новых з'яў, вучаць правільнаму выкарыстанню прафесійнай тэрміналогіі. Да семінараў студэнты таксама рыхтуюць паведамленні даследчага характару, прысвечаныя актуальным і дыскусійным пытанням бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства, выступаюць з вынікамі экспертнай ацэнкі асобных раздзелаў краязнаўчых фондаў бібліятэк г. Мінска (і іншых рэгіёнаў і населеных пунктаў па жаданні студэнтаў).

Заданні для самастойнай работы, асабліва тыя, якія выконваліся ў камп'ютарных класах і бібліятэках, мелі індывідуальны характар і розны ўзровень складанасці, што знаходзіла адпаведнае адлюстраванне і ў сістэме ацэнак. Індывідуалізацыя заданняў – важная і прывабная іх характарыстыка ва ўспрыйманні студэнтамі, якая спрыяе не толькі праяўленню іх прафесійнай падрыхтаванасці, але і раскрыццю іх творчых здольнасцей, а таксама і праяўленню патрыятычных пачуццяў. Магчымасць вольнага выбару рэгіёна (населенага пункта) пры выкананні некаторых відаў КСРС паказала заканамерны выбар студэнтамі «малой радзімы» (а не, напрыклад, Мінска, у якім студэнты так імкнуцца працаўладкавацца і многія ўжо працуюць у бібліятэках). Гэта праявілася пры выкананні заданняў па бягучаму і рэтраспектыўнаму камплектаванню краязнаўчага фонду, вызначэнні краязнаўчай каштоўнасці дакументаў, планаванню бібліяграфічнай работы, падрыхтоўцы бібліяграфічнай работы і інш. Шэраг студэнтаў уключылі ў падрыхтаваныя бібліяграфічныя дапаможнікі унікальныя неапублікаваныя матэрыялы, сабраныя мясцовымі бібліятэкамі і музеямі, рэдкія выяўленчыя матэрыялы, некаторыя зрабілі фатаграфіі мясцовых гісторыка-культурных помнікаў, што знаходзяцца пад пагрозай разбурэння, выявілі і апрацавалі дадзеныя пра іх і інш. Тут вучэбная, прафесійная матывацыя яскрава дапаўняецца асабістай грамадзянскай пазіцыяй, і гэта стымулюе некаторых студэнтаў выканаць больш складаную працу, чым ставілася задача. Гэты «выхаваўчы эфект» КСРС праявіўся і падчас абмеркавання прац, дзе студэнты выказалі дакладныя меркаванні не толькі ў сувязі з метадычнай якасцю падрыхтаваных інфармацыйных прадуктаў,

але і сваю заклапочанасць пытаннямі зберажэння гісторыка-культурнай спадчыны, экалогіі і інш.

Эфектыўнай формай кантролю ведаў з'яўляецца і тэсціраванне. Праведзеныя 2 рубежныя тэставыя кантролі змяшчалі заданні рознага ўзроўню складанасці і ахоплівалі заданні адкрытай і закрытай формаў, заданні на ўстанаўленне адпаведнасцей і правільнай паслядоўнасці. Ацэньваліся як па палітамічнай, так і па дыхатамічнай методыцы. Тэсты дапамаглі студэнтам глыбей засвоіць тэарэтычныя, арганізацыйныя, метадычныя і тэхналагічныя пытанні бібліятэчна-бібліяграфічнай краязнаўчай дзейнасці.

Выяўленыя па ходу праходжання модуляў недахопы (прабелы і недакладнасці тэарэтычных ведаў, памылкі метадычнага характару, недастатковасць засваення тэхналагічных працэсаў і аперацыйі інш.) мы разглядаем падчас групавых і індывідуальных кансультацый. Студэнты, якія прапусцілі тэсціраванне або іншыя формы кантролю ведаў па ўважлівых ці не ўважлівых прычынах, здавалі іх у дні кансультацый, пасля чаго дапускаліся да формы выніковага кантролю. Нізкі рэйтынг некалькіх студэнтаў па дысцыпліне, з-за чаго яны не былі дапушчаны да заліку, звязаны з іх асабістымі прычынамі (па даных дэканата яны маюць запазычанасці і па іншых курсах).

Выкарыстанне модульна-рэйтынгавай сістэмы арганізацыі КСРС па бібліятэчна-бібліяграфічнаму краязнаўству дазволіла арганізаваць раўнамерную дзейнасць студэнтаў па вывучэнні прадмета, больш глыбока і грунтоўна засвоіць яго, дасягнуць выканання тэрміну кожнага модулю; аб'ектыўна і ўсебакова ацаніць веды, уменні і навыкі студэнтаў у выглядзе іх рэйтынгу, стымуляваць іх для атрымання больш высокіх ацэнак не толькі шляхам заахвочвання да атрымання заліку «аўтаматам», але і праяўлення крэатыўнасці, імкнення да інавацый, лепшых грамадзянскіх якасцей.

Далейшая праца па ўдасканаленні арганізацыі КСРС будзе накіравана на падрыхтоўку да выдання вучэбнага дапаможніка па дысцыпліне «Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства», пашырэнне вучэбна-наглядных матэрыялаў, распрацоўку і выданне рабочых сшыткаў для студэнтаў па курсу, якія будуць змяшчаць умовы модульна-рэйтынгавай сістэмы: пералік модулей, іх змест, спісы вучэбна-метадычнай літаратуры, сістэму ацэнкі студэнтаў па курсу, календарны графік КСРС і інш.

Аптымізацыя арганізацыі КСРС па бібліятэчна-бібліяграфічнаму краязнаўству дазволіць удасканаліць падрыхтоўку спецыялістаў, якія валодаюць сучаснымі тэхналогіямі інфармацыйна-бібліятэчнай дзейнасці і якія змогуць звязаць бібліятэчную работу з перспектывамі развіцця рэгіёнаў, забяспечыць трансляцыю дакументаванай гісторыка-культурнай спадчыны рэгіянальнай супольнасці.

**Спіс літаратуры**

1. *Жук, О. Л.* Организация самостоятельной работы студентов в логике компетентностного подхода / О. Л. Жук // Выш. шк. – 2005. – № 2. – С. 45–50.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. *Лобанов, А. П.* Управляемая самостоятельная работа студентов в контексте инновационных технологий / А. П. Лобанов, Н. В. Дроздова. – Минск, 2005. – 107 с.
3. Педагогические основы самостоятельной работы студентов: пособие для преподавателей вузов и студентов / под общ. ред. О. Л. Жук. – Минск, 2005. – 112 с.
4. *Решетникова, И. В.* Организация и контроль управляемой самостоятельной работы студентов / И. В. Решетникова // Выш. шк. – 2007. – № 2. – С. 33–37.
5. *Сергеенкова, В. В.* Управляемая самостоятельная работа студентов. Модульно-рейтинговая и рейтинговая системы / В. В Сергеенкова. – Минск, 2004. – 132 с.